



# Мастацтва Беларусі

## IX - XIII стагоддзяў




# АРХІТЭКТУРА

## Сафійскі Сабор у Полацку



Пабудаваны ў 1044 – 1066 гг.

У Полацкай Сафіі ўвасоблена моц і ўплывовасць Полацкага княства.

Сабор Святой Сафіі быў галоўным грамадскім будынкам у горадзе. Шмат разоў перабудоўваўся і дайшоў да нас у выглядзе, набытым у XVIII ст.

Будынак зроблены з плінфы ў тэхніцы паласатай муроўкі са схаваным радам. Унутраная прастора падзялялася 16 слупамі на 5 падоўжаных нефаў. Пасярэдзіне будынка змяшчаўся галоўны купал, вакол якога групавалася яшчэ 4 меншых. Сцены ўнутры сабора былі распісаны фрэскамі і ўпрыгожаны мазаікай.



Сафійскі Сабор у Полацку. Рэканструкцыя





Фрагменты кладкі
Сафійскага сабора XI ст.





Фрагменты муроўкі і макет Сафійскага сабора XI ст.

# Фрагменты роспісаў Сафійскага Сабора XI ст.







# Полацкая архітэктурная школа



## Спаса-Праабражэнскі Сабор Ефрасінеўскага манастыра

Храм пабудаваны паміж 1128 і 1156 гг. дойлідам Іаанам. Існуе павер’е, што сама Ефрасіння Полацкая, якая шмат зрабіла для развіцця пісьменнасці ў Полацку, і была ініцыятарам будаўніцтва гэтай царквы.

Храм знаходзіцца на высокім беразе ракі Палаты.





# Роспісы Спаса-Праабражэнскага сабора
# паса-Ефрасіннеўскага манастыра
# Полацку






Былі выкананы ў XII стагоддзі. Гэта адзіны помнік, які дайшоў да нашага часу ў амаль непашкоджаным і першапачатковым варыянце.





**У купале Спаса-Праабражэнскага сабора размешчана выява Спаса, на ветразях - выявы евангелістаў, у конусе апсіды - выява Маці Боскай Аранты. Роспісы падзяляюцца на некалькі ярусаў-рэгістраў. Распісаны таксама і ўнутраныя слупы, на кожнай грані якіх размешчаны выявы святых.**



Роспісы паўднёвай і паўночнай сцен сабора пабудаваны з арыентацыяй на візантыйскую схему – выцягнутыя твары, плоскаснасць, недасягальнасць,





# Дабравешчанская царква ў Віцебску



Выгляд царквы XII ст.





Фрагмент інтэр'еру царквы

**Пабудавана ў 1120 – 1130 гг. Храм размешчаны на левым беразе Дзвіны, на тэрыторыі былога Ніжняга палацу. Царква ўяўляла сабой шасціслуповы, аднакупальны, трохапсідны храм. Унутраная прастора дзялілася на тры нефа. Сярэдні неф меў скляпенчатыя перакрыцці, бакавыя нефы – крыжовыя. Арганічны і творчы сінтэз *раманскіх* і *візантыйскіх* элементаў - найбольш выразная адметнасць архітэктуры царквы. Для фрэсак гэтага храму ўласціва выкарыстанне цёмна-жоўтай вохры, ружовага і блакітнага колераў, зялёнага і сіняга фона.**





**На працягу стагоддзяў царква шмат разоў перабудоўвалася і мяняла знешні выгляд. У 1961 г. па ініцыятыве партыйных улад Дабравешчанская царква была ўзарвана. Ад помніка засталіся рэшткі, у якіх старажытныя часткі маюць месцамі вышыню да 5 м. У 1990-ых гг. быў распрацаваны праект і ажыццяўлена рэстаўрацыя царквы.**



# Гродзенская архітэктурная школа



## Царква святых Барыса і Глеба ў Гродна (Каложская)

**Пабудавана царква ў XII ст. Ініцыятарамі будаўніцтва царквы былі гродзенскія князі Барыс і Глеб, або іх бацька – Усевалад Давідовіч, праўнук кіеўскага князя Яраслава Мудрага. Размясцілася царква над Нёманам на высокім пагорку. З даўніх часоў гэта мясцовасць мела назву Каложа. Будынак адносіцца да шасціслуповых трохапсідных храмаў крыжова-купальнай сістэмы. Пры будаўніцтве храма выкарыстоўвалася цэгла і плінфа.**







## Фрагменты сцен царквы



**На фасадзе царквы Барыса і Глеба паверхня сцен выкладзена рознакаляровымі камянёвымі крыжамі, у ніжніх частках сцен малюнак утвараюць валуны і керамічныя пліткі. Кладка сцен роўнаслойная, усе рады роўна выходзяць на фасад, а швы прыблізна роўныя таўшчыні цэглы. У склад цэмента ўваходзілі вапняк, пясок, вугаль і бітая цэгла.**

# Каложская царква. Інтэр'ер







У верхніх частках сцен знаходзілася вялікая колькасць галаснікоў, якія прызначаны для павышэння акустычных якасцяў храма. Царква славіцца цудатворнай іконай “Каложскай Багамаці”.





Інтэр'ер Каложскай царквы







# Вежа-данжон



- галоўная асобна размешчаная шмат’ярусная вежа чатырохграннай ці круглай формы, якая служыла ўмацаваннем, назіральным і камандным пунктам пад час ваеннай пагрозы.





# Камянецкая вежа (Белая)

Знаходзіцца ў горадзе Камянцы Брэсцкай вобласці і стаіць на высокім беразе ракі Лясной, пабудавана паміж 1271 і 1289 гг. дойлідам Алексам. Складзена вежа з пальчаткі. Вежа мае пяць ярусаў, злучаных лесвіцай, на якіх можна было размясціць значную колькасць воінаў. Такія вежы ўвайшлі ў абарончую сістэму беларускіх гарадоў ў XIII ст. Абарончыя вежы былі ўзведзены ў Брэсце, Наваградку, Гродна, Тураве і іншых гарадах.



Макет Камянецкай вежы ў разрэзе







# Скульптура

Абразок "Канстанцін і Алена"
Полацк, XII ст.



"Хрыстос Эмануіл"
Пінск, XII ст.



**Уласціва рытмічная ўпарадкаванасць складак аддзення, рытуальнасць рухаў, шматлікія і дакладна перададзеныя дэталі і разам з тым вызначаная ўмоўнасць твору, масіўнасць форм ў трактоўцы твараў застыласці пастаў іх фігур (уплыў раманскай культуры).**



**Абразок “Мікола і Стэфан”.**
**Першая палова XIII ст.**



**Абразок “Барыс і Глеб”.**
**Сярэдзіна XII ст.**



Абразок з выявай Маці Божай (вонкавы бок)
і апостала Пятра (адваротны бок).
Канец XII – пачатак XIII стагоддзяў.

# Кніжная мініяцюра



Да найбольш вядомых старажытных рукапісных кніг адносяцца ***"Тураўскае"*** (XI ст.), ***"Полацкае"*** (XIII – XIV стст.), ***"Аршанскае"*** (XIII ст.), ***"Астрамірава"*** (1056 – 1057 гг.) ***Евангеллі***, ***"Ізборнік Святаслава"*** (1073 г.). Для рукапісаў ранняга перыяду характэрны візантыйскі стыль, заснаваны на выкарыстанні простых і раслінных і геаметрычных матываў.



**Аршанскае Евангелле. XIII ст.**
**Старонка і ілюстрацыя**

# Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва

## Крыж Ефрасінні Полацкай

Крыж быў зроблены па загаду Ефрасінні ў 1161 г. лепшым ювелірам Кіеўскай Русі, які быў родам з Беларусі, майстром Лазарам Богшам. Даўжыня Крыжа 51,8 см, верхняга перакрыжавання – 14 см, ніжняга – 21 см. Твор выканы з дрэва. Да кожнай яго грані былі прымацаваны залатыя, сярэбраныя і пазалочаныя пласціны, на якіх змешчаны выявы Хрыста, Марыі, Іаана Прадцечы, Архангелаў Міхаіла і Гаўрыіла, апосталаў Пятра і Паўла, Мацфея, святой Ефрасінні, некаторых іншых святых. Асаблівую каштоўнасць надаюць размешчаныя на Крыжы часціцы святых мошчаў, якія былі прывезены ў Полацк спецыяльнай экспедыцыяй, якую накіравала прападобная Ефрасіння ў Візантыю.



Лёс гэтага выдатнага помніка трагічны. Пакінуты сярод “некаштоўных” рэчаў у Магілёўскім абкоме і гаркоме партыі, ён быў згублены ў час Вялікай Айчыннай вайны. Зараз яго месцазнаходжанне невядома.

У 1992 годзе было вырашана аднавіць усеправаслаўную святыню, што было даручана ювеліру-эмаліроўшчыку з Брэста Мікалаю Пятровічу Кузьмічу. У 1997 годзе адноўлены Крыж Ефрасінні Полацкай быў асвечаны ў Свята-Сімеонаўскім саборы Брэста, і зараз ён знаходзіцца ў храме Праабражэння Гасподня ў Полацкім Спаса-Ефрасіннеўскім манастыры.



## ПРАЕКТ ЗРОБЛЕНЫ ЯК ВУЧЭБНЫ ДАПАМОЖНІК ПА ПРАДМЕТУ

# ДЗЯКУЙ ЗА ЎВАГУ!

*аўтар праекта*
*Марыя Аляксандраўна Бабчанок*

31.10.2007 г.